Аддзел па адукацыі, спорту і турызму Дрыбінскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Пудаўнянская сярэдняя школа”

**Конкурс “Шляхам добрых спраў”**

# КРОКІ Ў БУДУЧЫНЮ

*(калектыўная работа)*




**Падрыхтавалі:**
Бачкарова Дар’я, 10 клас,
Бубнова Аліна, 10 клас,
Талкачоў Арцём, 10 клас
**Кіраўнікі:**
Гуляева Наталля Іванаўна,
Мікалуцкая Вольга Міхайлаўна
**Адрас:**
аг.Пудаўня, вул.Даманоўская, д.25
Магілёўская вобл., Дрыбінскі раён
Тэлефон: 8(02248)74629

# АТРАД «НАДЗЕЯ»









# АТРАД «МІЛАСЭРНАСЦЬ»

"Насустрач тым, каму патрэбна дапамога" – мэта і дэвіз валанцёрскай праграмы. На працягу шэрагу гадоў праграма развіваецца, ахопліваючы ўсё большую колькасць валанцёраў. Накірункі добраахвотніцкай дзейнасці шматвектарныя:

- ✓ сацыяльнае патраніраванне дзіцячых дамоў;
- ✓ сацыяльнае патраніраванне сталых людзей;
- ✓ медыцынская дапамога;
- ✓ педагагічнае суправаджэнне;
- ✓ сацыяльна-псіхалагічная і юрыдычная падтрымка;
- ✓ экалагічная абарона;
- ✓ інтэллектуальнае развіццё;
- ✓ спартыўная, турыстычная і ваенная падрыхтоўка;
- ✓ творчае развіццё;
- ✓ дзейнасць вольнага часу;
- ✓ сацыяльнае краязнаўства;
- ✓ працоўная дапамога;
- ✓ дапамога ў рэстаўрацыйных работах;
- ✓ аднаўленне і догляд за воінскімі пахаваннямі загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гадоў;
- ✓ экскурсійная дзейнасць;
- ✓ рамесніцкія майстэрні;
- ✓ інфармацыйнае забеспячэнне і нш.

Калі зыходзіць з дадзеных накірункаў, то атрымліваецца, што валанцёрская дзейнасць вучняў нашай школы налічвае не адзін год. Больш дакладна, каля 109 гадоў, бо 01.09.2019 года школе як установе адукацыі нашага населенага пункта спаўняецца 110 год. На пачатку такой работы не было нават паняцця "валанцёрскі атрад", але ў традыцыях нашага народа было добраахвотнае аказанне дапамогі, праяўленне клопату ў дачыненні да людзей, якім цяжка было вырашыць пэўныя жыццёвыя праблемы.

Мэтай работы школьнікаў пасля адкрыцця школы было не толькі навучанне: у паслярэвалюцыйны час паступова далучыліся да аказання дапамогі пажылым, нямоглым жыхарам вёскі Пудаўня і бліжэйшых навакольных вёсак, у якіх пражывалі вучні. Дзецям тых часоў даводзілася шмат працаваць не толькі фізічна, а яшчэ  дапамагаць у ліквідацыі неадукаванасці ў паслярэвалюцыйны час. Гэтыя звесткі мы атрымалі ад былога дырэктара Пудаўнянскай школы Кароткіна Івана Ісакавіча.На жаль, не засталося дакументальных сведчанняў яго расповедаў, бо Іван Ісакавіч ужо памёр.

Стары будынак школы наведвалі дзеці не толькі  з Пудаўні, а яшчэ і з навакольных вёсак – Карзеева, Цінькаўшчыны, Яськаўшчыны, Русінкі. Адпаведна маглі дапамагчы па месцы жыхарства.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны  вучні і настаўнікі прымалі ўдзел у прывядзенні школьнага будынка ў належны да навучання стан, дапамагалі сем'ям удзельнікаў вайны, асабліва тым, у якія не вярнуліся салдаты,састарэлым жыхарам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, якія

пражывалі ў нашым населеным пункце: Аўчыннікаву Цімафею Васільевічу, Узгорскаму Міхаілу Прохаравічу, Аўласцову Мікалаю Карнеевічу, Гаўрусёву Марку Мікалаевічу, Гаўрусёвай Ніне Іванаўне, Кароткіну Івану Іванавічу, Мазанкову Мікалаю Мікітавічу, Малахоўскаму Міхаілу Васільевічу.З ліку інвалідаў вайны,якіх апекавалі вучні Пудаўнянскай школы, да нас дайшлі прозвішчы Радыёнава Васіля Міхайлавіча, Шкоркіна Васіля Фёдаравіча, Хазяева Аляксея Васільевіча, Кулікава Аляксея Антонавіча, Шунцікава Захара Яфімавіча, а таксама ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны з вёсак Яськаўшчына (Белясава Івана Антонавіча, Героя Савецкага Саюза Лапянкова Івана Адамавіча), Цінькаўшчына (Дрэмухава Аляксея Фаміча), Даманы (Дудкова Сяргея Аксёнавіча).





**У час наведвання Узгорскага М. П.**



**Ветэраны – дзецям**





**Як жывеш, ветэран? (Дудкоў С. А.)**

Новы этап у жыцці школы пачаўся ў лютым 1996 года, калі навучэнцы перасяліліся ў новы будынак, у якім мы вучымся і зараз.

З цягам часу за вучнямі нашай школы замацавалася таксама работа па навядзенні парадку на грамадзянскіх могілках у вёсцы Даманы,Карзеева, Цінькаўшчыне, Яськаўшчыне, дзе і да гэтага часу знаходзяцца магілы невядомых салдат, пра якія працягваюць клапаціцца нашы навучэнцы.






**Асаблівы клопат – помніку-абеліску ў Пудаўні, каля якога традыцыйна праводзяцца мітынгі да Дня Перамогі, Дня Незалежнасці РБ**.

На першых парах добраахвотнікам даводзілася дабірацца на матацыкле, нават пешшу, каб трапіць у патрэбнае месца.

Абявязкова трэба зазначыць тое, што ў некаторых выпадках валанцёрскую работу нашы вучні выконвалі супольна з вучнямі іншых школ,а больш дакладна,такую дапамогу, прымеркаваную да 365-годдзя вёскі Пудаўня, аказалі школьнікі з Дрыбінскай СШ. У нашым школьным “архіве” захавалася нататка пра гэту суполку. Вось яе тэкст (па матэрыялах “Савецкай вёскі”) на мове арыгінала:

**РАБОТА – В РАДОСТЬ,**
**ОТДЫХ – НА УРОВНЕ**

Восемнадцать дней на территории Черневского сельского Совета работал трудовой лагерь, организаторами которого выступил районный комитет общественной организации БПСМ. Свою лепту в благоустройстве деревни Пудовни (на днях она будет праздновать 365-летие) внесли

учащиеся Дрибинской СШ: Руслан Баржемский, Александр Савченко, Игорь Давыденок, Тимур Музыченко, Юрий Воробьев, Роман Поляков, Александр Петряшов, Дмитрий Ефремов, Михаил Лытнев, Руслан Нейфельд, Андрей Тетерин, Дмитрий Иванов и Денис Корнейчук. Под руководством и.о. I-го секретаря РК 00 БПСМ Андрея Косачева и и.о. II-го секретаря Юлии Сафроновой ребята окультурили пудовнянское кладбище: произвели обрезку кустов, вынесли мусор, поправили оградки.

Кроме работ по благоустройству интересно прошел досуг подростков. По вечерам школьники посещали видеосалон и смотрели фильмы или ходили на дискотеку в местный СДК, днем они участвовали в различных спортивных мероприятиях, играли в футбол, баскетбол, шахматы и шашки. Благо этому способствовало и помещение, ведь трудовой лагерь в силу сложившихся обстоятельств (хотя участники так мечтали пожить в палатках) размещался в Пудовнянской СШ — в спортивном зале. С матрацами и спальными принадлежностями ребята обустроились прямо на матах и, глядя перед сном на звездное небо, уж, наверняка, надышались романтикой. Во всяком случае, высказали предложение организовать что-нибудь еще в таком же духе на осенних каникулах.

— У нас осталось много впечатлений о Пудовне, — признался мне директор лагеря Андрей Косачев. — Конечно, наши возможности не позволили сделать больше в канун 365-летия деревни, но то, что сделано — от души. Пусть только сельчане сами не забывают о могилах, где похоронены их близкие, пусть содержат эти места в чистоте. Мне бы еще хотелось поблагодарить через газету повара Пудовнянской СШ Т.Р.Абражееву, которая очень вкусно готовила, да и вообще заботилась о ребятах. Также проявили внимание к участникам лагеря работники пудовнянской амбулатории и районного отдела культуры.



Личными впечатлениями поделился с нашими читателями один из тех, кто трудился в Пудовне, — Роман Поляков:

— Лагерь мне очень понравился. Было так здорово. Работа – в радость. И отдых, и быт — все на уровне. В школе я любил играть в баскетбол, в лагере эти игры проходили еще интереснее, своеобразней. После всего увиденного я решил вступить в члены БПСМ. Это союз патриотов, и я тоже разделяю их патриотические чувства — созидать, а не разрушать, умножать богатства Родины. Я — патриот своей земли. Так сказать, авансом меня уже приняли в БПСМ, остались лишь некоторые формальности — оформление документов.

*Записала Светлана Васильева*

*на снимке: участник трудового лагеря в д. Пудовня Роман Поляков*

*фото Андрея Кулака*

Больш за дзясятак год прайшло з часу, калі добраахвотных памочнікаў рознага ўзросту сталі называць валанцёрамі, а адпаведнае аб’яднанне сталі атаясамліваць з паняццем “валанцёрскі атрад”. Калі закрануць гісторыю валанцёрскага руху ў Беларусі, то вядома, што афіцыйна пэўны грамадскі маладзёжны рух налічвае больш за 15 год, а ў цяперашні час тысячы маладых людзей удзельнічаюць у розных сацыяльных праектах, прычым ад іх высілкаў залежыць дзейнасць многіх грамадскіх арганізацый, сацыяльных установў.У Беларусі валанцёрскімі праектамі займаецца Рэспубліканская маладзёжная грамадская арганізацыя “Ліга добраахвотнай працы моладзі”, “Беларускае грамадства Чырвонага Крыжа”, “Надзея-Экспрэс”, арганізацыі ў ВНУ, цэнтры пазашкольнай работы і г.д. Дзяржава развівае сёння валанцёрскі рух з самага юнага ўзросту, са школы, і рэалізуецца ў БРСМ. “Ліга добраахвотнай працы моладзі ”супрацоўнічае з 43 арганізацыямі з 35 краін свету. Таксама трэба зазначыць, што ў рамках міжнароднага валанцёрскага супрацоўніцтва тысячы замежных добраахвотнікаў рознага ўзросту прыязджаюць і ў Беларусь. У прыватнасці, у межах толькі Дрыбінскага раёна валанцёрскімі намаганнямі з-за мяжы Беларусі была аказана вялікая працоўная і грашовая дапамога сацыяльнаму прытулку ў в.Белая, інтэрнату для дзяцей з псіхафізіялагічнымі асаблівасцямі ў в. Расна, Пудаўнянскаму дзіцячаму садку, былі набыты швейныя машыны для Дрыбінскай СШ, закуплен для паліклінікі Дрыбіна новы рэанімабіль і інш. Гэтыя дзеянні напрамую выцякаюць з задач валанцёрскага руху: прадастаўленне магчымасці нефармальнага ўтварэння, а менавіта, новага жыццёвага вопыту, ведаў, навыкаў міжасобасных зносін, міжкультурнага ўзаемадзеяння.



Валанцёрская дапамога стала традыцыйнай. Школьнікі прыходзяць на дапамогу нягледзячы на тое, што больш няма ў жывых удзельнікаў вайны,што за многімі састарэлымі, адзінокімі жыхарамі замацаваны сацыяльныя работнікі, а для навядзення парадку на могілках прыцягваюцца супрацоўнікі дзяржаўных працоўных арганізацый.

Справа ў тым, што сацыяльныя работнікі наведваюць сваіх падапечных у пэўныя дні,але бываюць такія жыццёвыя патрэбы, як нейкія тэрміновыя пакупкі, бытавыя цяжкасці,пры якіх ніяк не адмовяцца ад дапамогі валанцёраў.Асабліва складана нямоглым, хворым людзям, якія самі не заўсёды ў стане зрабіць дома добрую ўборку, выграбці апалую лістоту,пачысціць снег, паліць агарод ці схадзіць у аптэку, спілаваць нізка навіслыя галінкі дрэў,ускапаць зямлю пад градку, спалоць пустазелле на градцы ў кветніку. Для тых людзей, якія рэдка выходзяць з кватэры, вельмі важнай дапамогай з’яўляецца простая гутарка, псіхалагічная

падтрымка,букет кветак да свята ці віншаванне з нагоды дзяржаўных і грамадзянскіх падзей.











**Наведванне і віншаванне сталых людзей з аг. Пудаўня**

Не трэба забывацца і пра той факт, што сацыяльныя работнікі дапамагаюць за аплату, а валанцёры аказваюць бясплатную дапамогу.







**І пагутарым, і прыбяромся**



Наш валанцёрскі атрад носіць назву “Надзея”. Гэта вельмі сімвалічная назва, бо яна сцвярджае меркаванне пра тое, што ніколі не трэба адчайвайцца ні пры якіх складаных абставінах – як кажуць, свет не без добрых людзей. **Крэда** нашага атрада адлюстравалася ў наступных словах: “**Ніколі не губляйце надзеі і веры ў лепшае,таму што пасля самай чорнай ночы бывае дзень, і нават пасля самага моцнага ліўня ярка свеціць сонца”.**

Праяўленне дабрыні, міласэрнасці, клопату стала сэнсам валанцёрскай работы, якая праводзілася і працягвае ажыццяўляцца ў нашай школе. У склад атрада ўваходзяць школьнікі рознага ўзросту. Улічваючы ўзроставыя магчымасці навучэнцаў і формы аказання дапамогі людзям, у школе распрацавалі план работы валанцёраў, які ўключае наступныя накірункі:

- ✓ патрыятычны “Ніхто не забыты, нічога не забыта”;
- ✓ духоўны “Адчыні сэрца для дабрыні”;
- ✓ сацыяльны “Хто, калі не мы”;
- ✓ спартыўна-аздараўляльны “За сваё здароўе ў адказе”;
- ✓ працоўная дзейнасць “Праца – справа гонару і сумлення”;
- ✓ экалагічны “Планета – твой дом, будзь гаспадаром у ім”.

**Формамі работы па рэалізацыі праграмы з’яўляюцца:**

- ✓ акцыі;
- ✓ эстафеты, спартакіяды, спаборніцтвы;
- ✓ суботнікі, працоўныя дэсанты;
- ✓ экскурсіі, паходы;
- ✓ святы, конкурсы;
- ✓ школьныя лінейкі, лекторыі;
- ✓ афармленне выстаў малюнкаў,газет, лістовак;
- ✓ анкеціраванне, тэсціраванне.

Гэтыя формы работы распаўсюджваюцца як на дарослых, так і на навучэнцаў нашай школы.

**Запаведзі валанцёраў школы:**

1. Знайдзі таго, хто мае патрэбу ў тваёй падтрымцы, дапамажы, абарані яго.
2. Раскрывай сябе ў любой карыснай для людзей і цябе самога дзейнасці.
3. Помні, што твая сіла і твая каштоўнасць – у тваім здароўі.
4. Ацэньвай сябе і сваіх таварышаў не па словах, а па рэальных адносінах і ўчынках.

Зараджэнне неабыякавага стаўлення менавіта да школьнага асяроддзя адбываецца ў час грамадска-карыснай працы пад кіраўніцтвам настаўнікаў пачатковых класаў, у час працы на суботніках, а таксама ў час прагулак і працоўных дэсантаў у ГПД, калі дзеці рамантуюць кнігі, робяць упрыгожанні да навагодніх святаў, прыбіраюць тэрыторыю гульнёвых пляцовак, выконваюць праполку клумб ад пустазелля, выграбаюць апалае лісце, сочаць за навядзеннем санітарна-гігіенічнага парадку ў памяшканні і інш.





**Дрэвы – нашы сябры!** **Чысціня – залог здароўя**





**Вучыся парадку змалку**





**Дапамога ААТ "Пудаўня-агра"** **Студатрад.Збор парэчак**





**Вучымся быць валанцёрамі**

Дзеля ажыццяўлення пераемнасці ў выхаванні ў школе працуе атрад “Міласэрнасць”, у склад якога ўваходзяць вучні 5-7 класаў. На працягу летняга перыяду бягучага навучальнага года нашы вучні былі адказныя за аказанне дапамогі састарэлым і пажылым людзям, аказанне дапамогі ў РЦСАНе.









Навучэнцы 8-10 класаў аказвалі дапамогу састарэлым і пажылым людзям, займаліся добраўпарадкаваннем помнікаў і пахаванняў (аграгарадок Пудаўня, вёска Даманы), добраўпарадкаваннем дзіцячай гульнёвай пляцоўкі, аказвалі дапамогу ў падрыхтоўцы школы да новага навучальнага года, прыбіралі вадаёмы ад смецця.



Мяркую, што першыя крокі валанцёрскай дзейнасці пачынаюць з’яўляцца ў сем’ях, калі самі або па падказцы бацькоў, старэйшых дзеці выконваюць нейкія даручэнні, якія робяцца не за грошы, а дзеля дабра ці выказання павагі, спачування, клопату. Такім чынам закладваецца аснова чалавечнасці, пры якой няма чужой бяды і зайздрасці ад чужой радасці. Гэтую маральна-каштоўнасную лінію развіваюць дашкольныя,

школьныя ўстановы. Зыходзячы з таго, што некаторыя формы аказання дапамогі школьнікаў супадаюць з работай сацыяльных работнікаў, хочацца зрабіць некалькі прапаноў наконт удасканалення дзейнасці валанцёраў.

Па-першае, высветліць, колькі чалавек нашага населенага пункта мае вострую патрэбу ў наведванні,каб не было несістэмнага падыходу да работы. Па-другое,у якой менавіта дапамозе маюць патрэбу пэўныя людзі. Па-трэцяе, ці замацаваны за імі сацыяльны работнік; калі замацаваны, то па якіх днях і якую работу выконвае. Пажадана з самага пачатку размеркаваць вучняў атрада, каб школьнікі мелі магчымасць лепш пазнаёміцца са сваімі “падшэфнымі”. Па-чацвёртае,улічваючы ўзрастаючы ўзровень тэхнічнага забеспячэння людзей, можна аказваць інавацыйную дапамогу ў навучанні карыстання персанальным камп’ютарам, скайпам, мабільным тэлефонам. У буйных населеных пунктах такую дапамогу аказваюць у аб’яднаннях па ўзросце, пры бібліятэках, але не кожны хворы можа туды дайсці.Таму для паўнацэннай дапамогі абавязкова трэба ўлічваць стан здароўя пажылых людзей.

Традыцыйна асноўную частку работы валанцёраў складае дапамога састарэлым, хворым, нямоглым і адзінокім людзям у плане навядзення парадку як у памяшканні, так і на прыдваравой тэрыторыі, віншаванне са святамі, пасільная камунікатыўная і псіхалагічная дапамога. Пэўна, не столькі патрэбна бывае нейкая фізічная праца, колькі чыста чалавечыя камунікатыўныя ўзаеміны. З гэтай мэтай нашы валанцёры наведвалі сталых жанчын, якія перажылі страту блізкіх,родных, асабліва дзяцей, бо на ўсё жыццё такія страты застаюцца балючай, незагойнай ранай.Менавіта такую трагедыю перажываюць Белавусава Галіна Барысаўна,Трусава Алена Аляксандраўна.Нашы школьнікі рэгулярна наведваюць гэтых жанчын для дапамогі па дому, на прысядзібным участку, з задавальненнем гутараць, распытваюць аб розных жыццёвых падзеях, віншуюць са святамі. Бабулі рады пагутарыць, аблегчыць свой боль, падзяліцца пэўным жыццёвым вопытам.





Удзел у валанцёрскай рабоце сведчыць аб актыўнай жыццёвай пазіцыі, таму многія валанцёры з’яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі як школьных, так і пазашкольных мерапрыемстваў: акцый, конкурсаў, творчых аглядаў, на якіх займаюць прызавыя месцы. Так, Лісава Вікторыя ўдзельнічала ў мінулым навучальным годзе ў конкурсе “Лідар года”(1 месца – раён, грамата – вобласць), прымала ўдзел у алімпіядным руху (3 месца па матэматыцы і падзячны ліст па фізіцы на раённай алімпіядзе), у прафарыентацыйным конурсе “Праз творчасць – у прафесію жыцця”(1 месца), “Благодарственное письмо учителям” – 1 месца (раён),прызавыя месцы за ўдзел у літаратурных конкурсах “Мая Радзіма. Мая будучыня” (1 месца ў раёне і вобласці). Цімкова Таццяна стала пераможцай у рэгіянальным конкурсе “Лідар года” (раён –2 месца), суполка валанцёраў прымала ўдзел у конкурсе “Зажги костер добра” (1 месца ў раёне). Можна яшчэ доўга пералічваць поспехі і дасягненні нашых актывістаў з ліку валанцёраў.




**Удзел у акцыі “Зрабіць сімвал піянерскай ёлкі “Зубраня”**



**Абласны этап конкурса “Зажги костер добра”**




**Лідар года – 2018**
**Цімкова Таццяна**



**Лідар года – 2017**
**Лісава Вікторыя**








**Удзел у конкурсе на лепшую гірлянду да 9 мая**

**Акцыі супраць наркотыкаў і тытуню, СНІДу**


















**“Нашы" – сярод удзельнікаў юных выратавальнікаў-пажарных і на абласным піянерскім злёце**





## У любую пару года ёсць клопат і праца

  

Такім чынам, удзел у любым валанцёрскім атрадзе дапамагае выхоўваць у падрастаючага пакалення пазітыўныя маральна-каштоўнасныя ўстаноўкі,міласэрніцкія якасці, далучае да сацыяльна-актыўнай дабравольніцкай грамадскай дзейнасці. Пра гэта сведча і візітная песня валанцёраў Пудаўнянскай школы (на музыку да песні групы ”Зямляне” “Каскадзёры”):

**Визитка волонтеров**

Если жизнь, как машину,
В бытовой вдруг забросит кювет,
Волонтеры помогут,
И отряда прекрасней нет.
Помогая, мы можем сто жизней прожить,
Чтобы тех, кому плохо, добром окружить.

Припев:
Волонтеры, волонтеры,
Мы у случая прекрасного в гостях.
Волонтеры, волонтеры,
Помощь людям – это, в общем, не пустяк,
Это наша судьба –
Жить не можем иначе.

Ничем не рискуя,
Побеждаем проблемы и зло,
Если в жизни бы нашей
Так же нам бесконечно везло.
А проблемы ведь есть у людей без конца,
Мы заботой своей согреваем сердца!

Припев:
Волонтеры, волонтеры,

Мы у случая прекрасного в гостях.
Волонтеры, волонтеры,
Помощь людям – это, в общем, не пустяк,
Это наша судьба –
Жить не можем иначе.





Улічваючы назапашаны вопыт работы валанцёраў, можна сцвярджаць: пакуль існуе чалавечае грамадства, патрэбна будзе і бясплатная, своечасовая, бескарысная дапамога, добрае слова, душэўны клопат, і як вынік – выхаванне гуманнага стаўлення да ўсяго жывога. Таму валанцёрская работа будзе заўсёды патрэбна, бо менавіта такія адносіны спрыяюць захаванню асноў жыцця і правільных чалавечых узаемін.